**17 мая 2025 г. – 70 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Аляксандравіча Волчака (1955), географа, спецыяліста ў галіне гідралогіі сушы, водных рэсурсаў, гідрахіміі, доктара геаграфічных навук (Расія, 2006; Беларусь, 2007), прафесара (2008), педагога**



Аляксандр Аляксандравіч Волчак нарадзіўся 17 мая 1955 года ў в. Сачковічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых.

У 1972 годзе закончыў СШ № 5 г. Кобрына. З 1972 года па 1973 год працаваў слесарам на Кобрынскім ільнозаводзе.

У 1973 годзе паступіў на гідрамеліярацыйны факультэт Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута, які з адзнакай закончыў у 1978 годзе, атрымаў кваліфікацыю інжынера-гідратэхніка і быў напраўлены ў Яроміцкае БМУ Кобрынскага раёна на пасаду майстра ўчастка.

Пасля службы ў Савецкай арміі Аляксандр Волчак працаваў загадчыкам лабараторыі на кафедры сельскагаспадарчых меліярацый Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. У перыяд з 1984 года па 1987 год вучыўся ў аспірантуры Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (Мінск), дзе пад кіраўніцтвам загадчыка лабараторыі В. Н. Плужнікава падрыхтаваў кандыдацкую дысертацыю па тэме «Исследование пространственно-временных колебаний элементов водного баланса (на примере Белоруссии)» на атрыманне навуковай ступені кандыдата геаграфічных навук, якую ў 1988 годзе абараніў у інстытуце водных праблем Акадэміі навук СССР (Масква). Пасля заканчэння аспірантуры працаваў на кафедры сельскагаспадарчых гідратэхнічных меліярацый на пасадах асістэнта, а затым дацэнта.

Па хадайніцтву НАН Беларусі і Брэсцкага аблвыканкама быў створаны Аддзел праблем Палесся НАН Беларусі ў г. Брэсце, куды на пасаду намесніка дырэктара па навуковай працы быў запрошаны А. А. Волчак. Сумесна з дырэктарам, доктарам хімічных навук, прафесарам Н. П. Ярчаком, Аляксандр Аляксандравіч актыўна займаўся стварэннем і

станаўленнем першай у Брэсцкай вобласці структуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У 2006 годзе ў г. Маскве А. А. Волчак абараніў доктарскую дысертацыю «Закономерности формирования элементов водного баланса речных водосборов Беларуси в современных условиях». У 2007 годзе сумесна з акадэмікам У. Ф. Логінавым Аляксандр Аляксандравіч стаў лаўрэатам прэміі НАН Беларусі 2007 года за цыкл прац «Исследование гидрологического и климатического режимов территории Беларуси: современное состояние, изменения и прогноз». У лістападзе 2007 г. прыняў удзел у рабоце Першага з'езду навукоўцаў Рэспублікі Беларусь.

У 2008 годзе А. А. Волчаку прысвоена навуковае званне прафесара па спецыяльнасці «Геаграфія». З 2007 года па 2010 год Аляксандр Аляксандравіч з'яўляўся навуковым кіраўніком рэгіянальнай праграмы «Машыны, механізмы і сэрвіс».

У сакавіку 2009 года А. А. Волчак запрошаны ў Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт на пасаду дэкана факультэта водазабеспячэння і гідрамеліярацыі (з 2014 года - факультэт інжынерных сістэм і экалогіі). З 2009 года ён з'яўляецца членам навукова-метадычнага савета па спецыяльнасцях прыродаўладкавання і будаўніцтва вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў вобласці сельскай гаспадаркі.

А. А. Волчак – вядомы вучоны ў галіне гідралогіі, воднай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя. Аўтар больш за 1170 навуковых прац, у тым ліку 48 манаграфій, 21 вучэбных дапаможнікаў, 3 дапаможнікаў разнастайных міністэрстваў і ведамстваў, 21 вынаходстваў і карысных мадэляў. Актыўна ўдзельнічае ў навуковым жыцці рэспублікі, прымае ўдзел у навуковых канферэнцыях, дзе выступае з дакладамі, рэгулярна друкуе свае працы ў цэнтральных рэспубліканскіх і замежных выданнях. З'яўляецца галоўным рэдактарам серыі Весніка БрДТУ.

Вучоны вядзе вялікую працу па падрыхтоўцы кадраў, чытае лекцыі студэнтам брэсцкіх універсітэтаў, кіруе аспірантамі, дапамагае маладым спецыялістам. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана і абаронена 12 магістарскіх і 6 кандыдацкіх дысертацый. Ім створана навукова-педагагічная школа «Брэсцкая гідралагічная школа».

З 2006 года А. А. Волчак з'яўляецца членам навукова-тэхнічнага савета Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», з 2010 года - член секцыі па пытаннях навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання Навукова-кансультатыўнага савета Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. З 2012 года уваходзіць у склад Міжведамаснай камісіі па пытаннях дзяржаўнай воднагаспадарчай палітыкі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і з'яўляецца намеснікам старшыні, экспертам Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў; членам савета па праблемах Палесся.

Па выніках рэспубліканскага конкурсу за выдатны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны быў удастоены персанальнай надбаўкі на 2011 год (распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.01.2011 г. № 30рп).

Узнагароджаны граматай (2012), Ганаровай граматай (2020) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Ганаровай граматай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь (2019). 24 снежня 2015 года А. А. Волчаку прысуджана званне «Ганаровы доктар УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна». За выдатныя дасягненні ў прафесійнай дзейнасці, значны асабісты ўклад у развіццё духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны беларускага народа Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2016 года ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Справу бацькі працягвае дачка – Анастасія Аляксандраўна Волчак, ураджэнка г. Кобрына (1981), кандыдат тэхнічных навук (2009), спецыяліст у вобласці гідраўлікі і інжынернай гідралогіі.

Аляксандр Аляксандравіч вядзе вялікую грамадскую працу. Будучы майстрам спорту па шашках і суддзёй па спорце Нацыянальнай катэгорыі, ён прапагандуе здаровы лад жыцця, актыўна ўдзельнічае ў спартыўным жыцці вобласці.

У 2021 годзе Аляксандр Аляксандравіч падараваў нашай установе шэраг навуковых выданняў, у тым ліку міжнароднае навуковае выданне «Природообустройство Полесья» ў некалькіх тамах, бібліяграфічны паказальнік «Александр Александрович Волчек» (Брест, 2020) з аўтарскім подпісам «Дорогим землякам в знак признательности».

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі

***Працы А. А. Волчака***

**Водные** ресурсы Брестской области / А. А. Волчек, М. Ю. Калинин. –Минск : БГУ, 2002. - 440 с.

**Гидрологические** расчеты : учебно-методическое пособие / А. А. Волчек, П. С. Лопух, Ан. А. Волчек. – Минск : БГУ, 2019. – 316 с.

**Закономерности** формирования элементов водного баланса речных водосборов Беларуси в современных условиях : дис…. д-ра геогр. наук : 25.00.27 / А. А. Волчек. – Брест, 2005. – 297 с.

**Исследование** пространственно-временных колебаний испарения / А. А. Волчек // Водное хозяйство и гидротехническое строительство. – Минск, 1989. - Вып. 18. - С. 5-9.

**Колебания** элементов водного баланса Беларуси / А. А. Волчек // Водные ресурсы. - Минск, 2003. - С. 132-143.

**Математические** методы обработки данных в экологии : учебное пособие / А. А. Волчек [и др.]. – Минск : РИВЩ, 2018. – 210 с : ил.

**Математические** методы в природообустройстве : учебное пособие для студентов высших учебных заведений / А. А. Волчек, П. С. Пойта, П. В. Шведовский. – Минск : Издательский центр БГУ, 2003. - 340 с.

**Математические** модели в природопользовании : учебное пособие / А. А. Волчек, П. В. Шведовский, Л. В. Образцов. – Минск : БГУ, 2002. - 282 с.

**Метеорология** и климатология : пособие для студентов высших учебных заведений по специальности “Природоохранная деятельность” / А. А. Волчек, Т. Е. Зубрицкая, И. Н. Шпока ; Министерство образования Республики Беларусь, Брестский государственный технический университет, Кафедра природообустройства. – Брест : БрГТУ, 2014. – 182 с.

**Многоводная** Припять / А. А. Волчек, Н. Н. Водчиц // Социально-экономическое и историко-культурное развитие Полесского региона в XXI веке : материалы международной науч.-практ. конф. (Пинск, 5-6 мая 2006 г.). – Пинск, 2006. – С. 88-90.

**Мухавец.** Энциклопедия малой реки : [монография] / А. А. Волчек [и др.] ; НАН Беларуси, Полесский аграрно-экологический институт. — Брест : Академия, 2005. - 346 с., [4] л. цв. ил. : ил., таб.

**Оценка** антропогенного воздействия на водные ресурсы рек Белорусского Полесья / А. А. Волчек, В. В. Лукша // Прыроднае асяроддзе Палесся : сучасны стан і яго змены : тез. докл. межд. научн. конф. - Брэст, 2002. - С. 177-182.

**Оценка** воздействия на окружающую среду : учебное пособие / А. А. Волчек, Л. В. Образцов, П. В. Шведовский ; БГУ, Институт повышения квалификации и переподготовки в области технологий информатизации и управления. – Минск : РИВЩ, 2015. – 193 с.

**Природообустройство** Полесья : монография : в 4 кн. / под общ. науч. ред. Ю. А. Мажайского, А. Н. Рокочинского, А. А. Волчека, О. П. Мешика, Е. Езнаха. – Рязань : Мещерский факультет ФГБНУ “ВНИИГиМ им. А. Н. Костякова”, 2018-2019.

**Пространственно-временные** колебания продуктивных влагозапасов минеральных почв Беларуси / А. А. Волчек, Н. Н. Шпендик // Экология и биология почв : материалы Международной научной конференции. - Ростов н/Д : Изд-во ООО «ЦВВР», 2004. - С. 52-57.

**Пространственные** корреляционные функции стока рек Белоруссии / А. А. Волчек, Г. В. Фолитар // Водное хозяйство и гидротехническое строительство. – Минск, 1988. - Вып. 17. - С. 12-16.

**Современное** состояние водных ресурсов Белорусского Полесья / А. А. Волчек, М. Ю. Калинин // Прыроднае асяроддзе Палесся: Сучасны стан і яго змены : тез. докл. межд. научн. конф. / ОПП НАН Беларуси. - Брэст, 2002. - С. 62-67.

**Оценка** суммарного испарения на территории Беларуси: современное состояние и прогноз / А. А. Волчек, Д. Н. Дашкевич // Экологический вестник. – 2013. - № 1. – С. 16-25.

**Колебания** и изменения суммарного испарения на территории Белорусского Полесья / А. А. Волчек, Т. Е. Зубрицкая // Вестник БГТУ. Водохозяйственное строительство, теплоэнергетика, экология. - 2003. - № 2. - С. 13-18.

**Синхронности** в колебаниях стока рек Беларуси и его оценка / А. А. Волчек // Природные ресурсы. - 2001. - № 2. - С. 25-48.

## Аб жыцці і дзейнасці А. А. Волчака

**Брестский** государственный технический университет. **Волчек** Александр Александрович // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск, 2019. – С. 366.

**Александр Александрович Волчек** : к 65-летию со дня рождения : библиографический указатель / Учреждение образования “Брестский государственный университет”, Библиотека ; сост. В. А. Федосюк, оформитель Ю. В. Азаркевич. – Брест : БрГТУ, 2020. – 226 с : фот.

**70 гадоў** з дня нараджэння А. А. Волчака (1955) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. – С. 164.

**Волчак Аляксандр Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 20-21 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Волчек Александр Александрович** : материал предоставлен библиотеке А. А. Волчеком в 2017 году. – Брест, 2017. – 6 с.

**Стрелец, М.** От рабочего до профессора. Александр Александрович Волчек / Михаил Стрелец // Брестская газета. – 2005. – 25 мая.

***Рэгіён:***

Пінскі раён
Сачковічы
Кобрынскі раён
Кобрын
Брэст

***Установы:***

Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітет імя А. С. Пушкіна

***Імёны:***

Волчак Аляксандр Аляксандравіч

***Прадметы:***

Географы
Вучоныя
Прафесары